На маю думку, 8 сакавіка -- гэта ніякае не свята, а проста перажытак савецкай спадчыны. Ды і прыдумала яго сацыялістка Клара Цэткін. А ў 1955 годзе савецкімі ідэолагамі была прыдумана легенда аб тым, што нібыта 8 сакавіка 1857 года работніцы тэкстыльных фабрык у Нью-Йорку выйшлі на дэманстрацыю ў знак пратэсту супраць цяжкіх умоў працы і нізкіх заробкаў. Але шэраг даследаванняў паказвае, што падзея пратэсту была штучна прыдумана з мэтай звязаць традыцыю святкавання жаночага дня з камуністычнай ідэалогіяй.

Такім чынам, не толькі для беларусаў, а і для іншых краін, якія адзначаюць гэты дзень, такое свята не мае ніякага сэнсу -- ні гістарычнага, ні духоўнага. Калі ж мы, беларусы, хочам надаваць нашым жанчынам знакі павагі, то можна гэта рабіць кожны дзень. А калі грамадству трэба вызначаная дата, то мы маем Дзень маці, які адзначаецца ў нашай краіне 14 кастрычніка. Вытокі гэтага свята ў павазе да жанчыны-маці. Менавіта мама дае першыя ўрокі дабрыні, духоўнасці і цярпімасці. Гэта асновы, без якіх немажліва стварэнне сям'і, фарміраванне грамадзянскай супольнасці і паўнавартаснае развіццё дзяржавы. Шанаваць маму -- гэта абавязак кожнага чалавека.

Значную ролю ў фарміраванні беларускай нацыі адыграла асветніца і апякунка Беларусі Еўфрасіння Полацкая. Яна была ў свой час адной з самых адукаваных жанчын Еўропы. Нашы продкі яшчэ 800 гадоў таму прызналі Еўфрасінню Полацкую святой. Разам з праваслаўнымі ў Беларусі святую Еўфрасінню прызнаюць і каталікі. А створаны на замову Еўфрасінні Полацкай крыж стаў святыняй нашай беларускай зямлі. За савецкім часам камуністы рэквізавалі гэтую святыню, і цяпер яе лёс невядомы. Дзень памяці святой Еўфрасінні Полацкай адзначаецца 5 чэрвеня. На маю думку, гэты дзень таксама варты, каб віншаваць нашых жанчын.

Мы, беларусы, мусім сур'ёзна задумацца над тымі датамі, якія адзначаем. Бо атрымліваецца, што пакланяемся мы бессэнсоўным датам, што засталіся нам ад імперыі зла, якая знішчала нашы святыні, а разам з імі і нашу памяць.

Сяржук БАХУН.

КРОПКІ НАД «і»

У нумары "Народнай волі" за 29 лютага г.г. быў змешчаны матэрыял "САМАВЫЗНАЧЭННЕ, народжанае ў пакутах", пад якім у якасці аўтара стаяла маё прозвішча. Я не з'яўляюся гісторыкам і не змог бы самастойна напісаць гэты артыкул, а тым больш падпісваць яго сваім імем. У сапраўднасці яго тэкст быў падрыхтаваны да друку мною на падставе публікацый гісторыкаў С.Рудовіча, В.Мазца, "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", двухтомніка "Архівы БНР" (Вільня, Нью-Йорк і інш., 1998). Таму лепей было б, каб подпіс пад названым артыкулам быў наступны: "Падрыхтаваў Л.Баршчэўскі па матэрыялах публікацый беларускіх гісторыкаў і архівістаў". На жаль, адзін з маіх намеснікаў, які прапаноўваў артыкул газеце, аб гэтым не падумаў і з яго падачы пад ім з'явіўся мой подпіс без усялякіх спасылак. Прашу прабачэння ў тых асоб, каго гэта магло закрануць.

Лявон БАРШЧЭЎСКІ,
старшыня Партыі БНФ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 КРАСАВІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Десятка лучших стран и десятка худших

Великобритания признана одной из самых стабильных и процветающих стран мира — в глобальной оценке ситуации и жизненного уровня она обошла Соединенные Штаты, Францию и даже Швейцарию.

По результатам продлившегося год исследования, авторы которого проанализировали данные о 235 странах и зависимых территориях, Великобритания заняла седьмое место в "премьер-лиге" государств. Помимо нее в десятку лидеров вошли Ватикан, Швеция, Люксембург, Монако, Гибралтар, Сан-Марино, Лихтенштейн, Нидерланды и Ирландия.

США оказались на 22-м месте, а Швейцария, которая обычно служит символом богатства и всеобщей стабильности, заняла 17-ю строчку — она уступила другим странам в социальной сфере. В десятку худших, что удивительно, не вошел Ирак. В самом конце списка находятся сектор Газа и Западный берег реки Иордан, Сомали, Судан, Афганистан, Кот-д'Ивуар, Гаити, Зимбабве, Чад, Демократическая Республика Конго и Центрально-Африканская Республика.

Великобритания получила высокую оценку несмотря на то, что ее войска находятся в Ираке и Афганистане, что 7 июля 2005 года террористы-смертники организовали взрывы в Лондоне и что сохраняется угроза со стороны террористов, а также несмотря на обрушение банка Northern Rock.

Глобальную проверку всех образований, которые ООН признает государствами или территориями, провела информационная организация Jane's Information Group. Кристиан Ле Мьер, управляющий директор подразделения этой организации, объясняет: "Великобритания — очень стабильная страна. Да, в ней есть террористические группы, но для борьбы с ними существуют эффективные службы безопасности. Мы приняли во внимание взрывы 7 июля, однако Великобритания все равно показала себя очень хорошо".

Ле Мьер говорит, что США оказались ниже, хотя все равно набрали 93 балла из 100, отчасти из-за распространенности стрелкового оружия среди американцев и наркотической угрозы населению в связи с притоком наркотиков из Мексики.

ФОТОВЗГЛЯД

Челси Клинтон участвует в избирательной кампании своей матери — сенатора Хиллари Клинтон.

В Пекине прошла Неделя китайской моды, на которой показывали последние модные купальники.

Ежегодная Международная ярмарка в болгарском Пловдиве "Винария", в которой участвовали представители 32 стран.

Они хотят мира, но народ слушает Хамас

Или почему израильтяне и палестинцы не могут договориться

Михаель Бар-Зохар — официальный биограф президента Израиля Шимона Переса, депутат кнессета. Но главное — исторические исследования этого профессора становятся бестселлерами. Корреспондент "ЕвроНьюс" записал это интервью на книжной ярмарке в Париже, где Бар-Зохар был почетным гостем.

"ЕвроНьюс":

— Как интеллектуал, политик и человек действия, скажите, какую роль может сейчас играть ЕС на Ближнем Востоке, в момент, когда идут разговоры о создании Средиземноморского союза?

Бар-Зохар:

— Я думаю, что Европе Ближний Восток действительно близок, с ним Европу связывают давние дипломатические традиции. Европа понимает проблемы Ближнего Востока лучше, чем более удаленные державы, как США или Россия, которые исполнены доброй воли, но не понимают реальной политики в регионе. Я думаю, что у Европы есть все для того, чтобы играть роль посредника, уважаемого обеими сторонами конфликта.

— Но множество израильтян считают, что в любом случае Америка всегда заступится за Израиль и защитит его в отличие от Европы, которую считают слишком дружелюбной к арабской стороне.

— Это правда, что США... ну, скажем, идут на все, если выживание Израиля оказывается под угрозой. Но что касается дипломатии, то с 1967 года США так и не смогли запустить дипломатический процесс на Ближнем Востоке.

Европейцы, как раз потому, что их в арабском мире считают друзьями, вызывают там меньше подозрений, меньше сомнений. Поэтому арабы менее скептичны в отношении европейских предложений и более склонны следовать тому, что говорит Европа.

— А что скажете о европейских политиках, которые считают, что пора признать Хамас и начать диалог с этой структурой?

—Я хотел бы надеяться, что это ошибка. Сторонники этой идеи просто не понимают, что происходит в реальности. Уверен, они не знакомы с программой Хамас и целями этой структуры".

— Говорят о том, что Хамас — это чудовище, порожденное Израилем, его секретными службами с целью подорвать власть Ясира Арафата, который в то время возглавлял ООП.

— В истории часто случается, что выбор или решение кажется разумным и оправданным в момент принятия, но через год или два... Вспомним Афганистан, где США вооружили талибов для борьбы против "Советов". Муджахедами на Западе публично восхищались, они были лучшими друзьями и союзниками, а 5 лет спустя стали смертельными врагами. Израиль сделал то же самое в определенный момент, создавая и поддерживая исламистское движение в палестинских деревнях. Идея состояла в том, чтобы поддержать мирное движение, договориться с местными старейшинами и использовать их религиозность для движения к миру. Идея была хороша, но дело пошло дальше. Так всегда и бывает, когда нет понимания, куда может привести движение, начатое вашим импульсом.

— Кто из политиков виновен в этом?

— Многие обвиняют Шарона, который якобы стоял за этой идеей. Я этого не знаю точно, но даже если он ответственен, он вовсе не желал того результата, который мы получили. Не ошибается тот, кто ничего не делает. Когда создавался Хамас, это была совершенно иная организация. Такое бывает с партиями и движениями, которые по ходу развития полностью меняют свое лицо.

— Но рано или поздно Израиль начнет переговоры с Хамас?

— Если их признать, они станут еще сильнее. Получив дипломатическое признание, они почувствуют себя сильнее, но не откажутся от идеи сбросить Израиль в море. Арафатовская ООП разделяла эти цели, но потом Арафат изменил убеждения. Однако он не остановил вооруженную борьбу и придерживался этой позиции даже во время мирных переговоров. Это создавало проблемы. Он не был готов пройти весь путь и не решился на болезненный компромисс. А мы были готовы к этому.

— Почему, на ваш взгляд, реальное предложение по всеобъемлющему урегулированию так и не было выдвинуто?

— Предложения готовы, мы хоть завтра готовы договориться с палестинцами. Проблема в лидерах. Нам нужны лидеры, которые смогут принять болезненный компромисс и со стороны Израиля, и со стороны Палестины. Махмуд Аббас, премьер-министр Салим Файяд и Ахмед Куреи — главный переговорщик — честные люди, они на самом деле хотят мира, я восхищаюсь их стремлением к миру. Их проблема в том, что они не могут увлечь за собой народ. Люди склонны больше слушать Хамас.

— То есть, по-вашему, у обеих сторон нет лидеров, способных решить задачу?

— Нет. Сейчас есть только один палестинский лидер, который может все изменить. Это Баргути, сидящий в израильской тюрьме за терроризм. Но я считаю, что в итоге у Израиля нет выбора. Мы должны освободить его, потому что этот человек, сражавшийся с нами и творивший чудовищные дела, сегодня согласен с нами, что у нас нет иного выбора. Нам нужен мир. У него есть авторитет и харизма, люди пойдут за ним. Проблемами остается Иерусалим и право палестинских беженцев вернуться на свои земли. Чтобы решить проблемы, нужен палестинский лидер, который скажет: "Право беженцев отменено течением времени. Израиль накогда не примет назад миллионы беженцев, потому что это будет означать конец Израиля". С другой стороны, нам нужен израильский лидер, который должен сказать народу, что 95% или 96% земель, которые сейчас оккупирует Израиль, должны быть возвращены палестинцам. Для этого нам нужен по-настоящему сильный лидер!

КАЛЕЙДОСКОП

Самый маленький

Двадцатилетний житель Китая Хэ Пинпин, рост которого всего 73 сантиметра, признан самым маленьким человеком на Земле. Как сообщает Ananova.com, сертификат о достижении рекорда китаец получил из редакции Книги рекордов Гиннесса.

Для установления рекорда комиссия трижды измерила рост Пинпина — утром, днем и ночью. Теперь достижение китайца войдет в Книгу рекордов Гиннесса 2009 года.

Родители Пинпина и две его сестры нормального роста. По словам отца рекордсмена, при рождении Пинпин был размером с ладонь взрослого человека.

Самым большим человеком на планете долгое время считался 56-летний соотечественник Хэ Пинпина Бао Сишунь. Его рост составляет 2 метра 36 сантиметров. Однако в сентябре 2007 года был найден новый рекордсмен — украинец Леонид Стадник ростом 2 метра 55 сантиметров.

Непобедимая Тэн

В ботаническом саду в пригороде Токио самка попугая демонстрирует интеллектуальное превосходство над посетителями. 6-летняя птичка по кличке Тэн при помощи клюва и одной лапы распутывает сложные головоломки из проволоки.

Птица разделяет два звена металлической цепи за 30 секунд. У людей же на это в среднем уходит около часа. Каждый день Тэн проводит несколько поединков со всеми желающими и пока остается непобежденной, передает НТВ.

Собака, которая "молится"

В одном из буддистских храмов Японии посещаемость повысилась на 30% после того, как в молитвах стала участвовать собака.

Она поднимает передние лапы и сводит их перед носом. "Возможно, она так благодарит за то, что ее угощают и гуляют с ней", — говорит священник Дзёэи Йосикуни из храма на острове Окинава.

По словам священника, "молиться" Конан научился за несколько дней: "Я думаю, он видел, как я это делаю, и научился".

Миллионер жарит котлеты

Молодой британец, выигравший в Национальную лотерею 1,3 миллиона фунтов стерлингов, спустя полтора года не выдержал праздной жизни рантье и вернулся к работе в одном из ресторанов быстрого питания сети McDonald's, сообщает британское издание Daily Mail.

После получения выигрыша 25-летний житель Кардиффа Люк Питтард вел приличествующий миллионеру образ жизни: он купил новый дом, отпраздновал пышную свадьбу и провел медовый месяц на Канарских островах. Но спустя полтора года соскучился по прежней работе в ресторане быстрого обслуживания и попросил руководство восстановить его в прежней должности.

Теперь Питтард жарит на кухне котлеты для бургеров за 5,85 фунта в час, что намного меньше денег, которые он получает как проценты от вкладов, но при этом чувствует себя абсолютно счастливым.

Умная диета

Если будущая мама будет регулярно употреблять рыбу, это позволит ей иметь ребенка с более высоким интеллектуальным уровнем. Об этом сообщает британский еженедельник "Индепендент он Санди" со ссылкой на новейшие работы специалистов американского Гарвардского университета.

В ходе широких исследований ученые установили, что те дети, матери которых после четвертого месяца беременности по меньшей мере три раза в неделю употребляли рыбные блюда, являются более смышлеными и обладают более гибкой нервной системой, передает ИТАР-ТАСС.

По мнению специалистов, содержащиеся в рыбе минералы и активные химические соединения, включая жирные кислоты, способствуют более активному развитию ребенка. Однако еженедельник предупреждает, что прежде чем переходить на рыбную диету, женщине все-таки следует проконсультироваться с врачом.

Две чумы

Президент Эстонии Тоомас Хендрик ИЛЬВЕС назвал депортацию эстонцев советскими властями в Сибирь актом геноцида, доказывающим, что сталинизм ничем не отличался от нацизма.

Выступая в день 59-й годовщины начала массовых высылок этнических эстонцев, латышей и литовцев из бывших советских республик, Ильвес заявил: "В марте 1949 года произошел прямой геноцид, преступление против человечности. Более 3 тысяч из тех, кого увезли 59 лет назад, больше никогда не увидели родину".

"Они умерли на чужой земле. Единственной причиной была их национальность, их семья, их образование, их образ мысли", — цитирует Би-Би-Си слова президента Эстонии.

В течение трех дней 1949 года советские спецслужбы депортировали из прибалтийских республик более 20 тысяч человек. В годовщину этого события на многих железнодорожных станциях в Эстонии состоялись поминальные церемонии, сообщает вебсайт эстонского общественного телевидения.

Спикер парламента страны Эне Эргма добавляет: "Это красная чума и коричневая чума. И они были одинаковые. Это надо понимать".

"Нельзя не отметить кардинально различающееся поведение стран-правопреемниц, представлявших эти идеологии. Одна — раскаивается, вторая — оправдывает. До сих пор", — цитирует президента Эстонии агентство "Интерфакс".

По эстонскому законодательству участие в депортации было объявлено преступлением против человечности, не имеющим срока давности, еще в 1988 году.

Выступление эстонского президента еще раз подчеркивает глубину конфликта с Россией из-за интерпретации событий, связанных со Второй мировой войной и включением Эстонии в состав Советского Союза.

Эстония настаивает, подчеркивает Би-Би-Си, что Советский Союз оккупировал ее в 1940 году после заключения пакта о ненападении с Гитлером, и его действия ничем принципиально не отличаются от действий нацистской армии, которая заняла территории стран Балтии в 1941 году, когда Гитлер нарушил пакт Молотова—Риббентропа.

Москва считает, что юридически действия СССР нельзя трактовать как оккупацию, а репрессии на территории Прибалтики были такими же, как на всех других советских территориях, и они уже давно подверглись осуждению. В сравнениях между Сталиным и Гитлером многие близкие к власти комментаторы в России видят стремление, как они выражаются, к "пересмотру итогов Второй мировой войны".

ПОДРОБНОСТИ

За «негативное отношение к действующей власти»?

Генеральная прокуратура Казахстана сообщила, что бывший зять президента Казахстана Нурсултана Назарбаева Рахат Алиев приговорен к 20 годам лишения свободы с конфискацией имущества.

Рассмотрение дела и вынесение приговора проходили в Военном суде, в отсутствие Алиева. Вместе с Алиевым к такому же наказанию приговорен бывший глава комитета национальной безопасности Казахстана Альнур Мусаев. Всего по делу проходили 16 человек. В январе Алиев уже был приговорен к 20 годам лишения свободы по делу о похищении топ-менеджеров "Нурбанка".

Как сообщает агентство РИА "Новости", в вину им вменялся целый ряд преступлений, в том числе — злоупотребление властью и служебным положением, хищение государственного имущества в крупном размере, создание и руководство организованной преступной группой.

Теперь же основной пункт обвинений — действия, направленные на насильственный захват власти. Официальный представитель Генпрокуратуры Сапарбек Нурпеисов на брифинге в Астане заявил, что немаловажное место в планах захвата власти занимала подготовка общественного мнения. Для этой цели была создана медиа-структура, которая через подконтрольные средства массовой информации формировала в массовом сознании стойкое негативное отношение к действующей власти.

В телефонном интервью Би-Би-Си из Вены Рахат Алиев отметил, что его преследования начались после сделанных им в мае прошлого года критических заявлений о том, что конституция страны переделывается под Нурсултана Назарбаева. Алиев расценивает действия властей как месть за то, что он не отдал медиа-активы (холдинг "Алма-медиа"). Рахат Алиев также заявил, что собирается подать заявление в Комиссию по правам человека ООН.

Алиев, который занимал должность посла Казахстана в Австрии, утверждает, что попал в опалу в связи со своими политическими устремлениями: ранее он заявлял, что в 2012 году намерен баллотироваться на пост президента и провести в Казахстане масштабные реформы.

Рахат Алиев был женат на старшей дочери президента Дариге Назарбаевой, с которой, по его словам, его развели без его согласия, так как Назарбаев оказывал давление на дочь.

Аддзяленне Пасольства Швецыі ў Мінску, Шведскі інстытут, кінатэатр "Цэнтральны"

Фестываль дзіцячага шведскага кіно ў сталічным кінатэатры "Цэнтральны", прысвечаны 100-гадоваму юбілею Астрыд Ліндгрэн

Казачны свет Астрыд Ліндгрэн

Астрыд Ліндгрэн — адна з самых вядомых у свеце і, безумоўна, самая знакамітая ў Швецыі дзіцячая пісьменніца. Яна натхніла многія пакаленні юных чытачоў і назаўсёды змяніла шведскую дзіцячую літаратуру. Астрыд Ліндгрэн — не проста казачніца, якая ўмела прыдумляць цікавыя гісторыі, яна разумела пачуцці і патрэбы дзяцей лепш, чым псіхолагі таго часу, і валодала рэдкай здольнасцю казаць пра складаныя філасофскія праблемы з пазіцыі дзіцяці. У рамках фестывалю маленькія гледачы атрымаюць магчымасць паглядзець тры дзіцячыя фільмы па матывах твораў Астрыд Ліндгрэн.

12 красавіка ў 11.00, 13.00. "Кале Блюмквіст і Размус"

(1197, 35 мм, Dolby SR, 89 хв., англійскія субцітры і беларускі пераклад).

Рэжысёр — **Ёран Кармбак.**

Ролі выконваюць — **Мальтэ Форсберг, Ульям Сведберг, П'ер Ліндштэт, Ёзэфін Орлінг.**

Фільм расказвае гісторыю дзяцей з маленькай шведскай вёсачкі. Яны падзелены на дзве варожыя групы, белыя і чырвоныя ружы, і змагаюцца за камень, які, здаецца, не мае ніякай каштоўнасці. Але бесклапотнае лета раптам напаўняецца праблемамі: бандыты захапілі прафесара і яго пяцігадовага сына Размуса і патрабуюць формулу аднаго з вынаходніцтваў у прафесара. Час для Кале Блюмквіста зноў стаць дэтэктывам...

13 красавіка ў 11.00, 13.00. "Ты здурнела, Мадзікен?"

(1979, 35 мм, mono, 85 хв., англійскія субцітры і беларускі пераклад).

Рыжысёр — **Ёран Графман.**

Ролі выконваюць: **Юана Лільендаль, Ліў Альстэрлюнд, Моніка Нурдквіст.**

Мадзікен — сямігадовая дзяўчынка. Яна жыве з мамай, татам, малодшай сястрычкай Лісабэт, пудзелем Сасо, кацянятам Гусан і сяброўкай Альвай у вялікім чырвоным доме ля ракі ў маленькім шведскім гарадку. Дзеянне адбываецца ў 1915 годзе. У Мадзікен узнікае шмат дзіўных ідэй, праўда, яна ніколі іх не ажыццяўляе — да аднаго цудоўнага моманту.

14 красавіка ў 13.00, 15.30. "Ронья, дачка разбойніка"

(1984, 35 мм, Dolby Stereo, 126 хв., англійскія субцітры і беларускі пераклад).

Рэжысёр — **Таге Даніэльсан.**

Ролі выконваюць: **Ханна Цэттэрберг, Дан Хофстром, Бор'е Альштэт, Лена Німан, Алан Эдваль.**

У тую ноч, калі нарадзілася Ронья, над гарамі бушавала навальніца. Але Мат быў настолькі рады нараджэнню дачкі, што не заўважыў непагоды. Яго род будзе працягвацца, а жыццё Боркі абарвецца. Борка — галоўны вораг, а бацька і дзядуля Боркі былі галоўнымі ворагамі бацькі і дзядулі Мата. Але ў тую ноч, калі нарадзілася Ронья, жонка Боркі нарадзіла сына. Ронья вучыцца скакаць і таньчыць ды крычаць разам з іншымі разбойнікамі, але яна адчувае сябе адзінокай у лясах Мата. Аднойчы яна сустракацца таемна ў самай гушчы лесу. Прыгоды пачынаюцца...

Кошт білета: 11.000 рублёў.
Тэл. даведак: 200-34-16.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 КРАСАВІКА 2008 г.

Галіна Пазьняк

Беларусь у сэрцы

(Працяг. Пачатак у №№7–10, 13–14, 17–18, 21–22, 25–26, 29–30, 33–34, 37–38, 41–42, 45–46.)

12 КРАСАВІКА 1995 ГОДА — ГАЛАДОЎКА І ЗЬБІЦЬЦЁ ДЭПУТАТАЎ АПАЗІЦЫІ БНФ

Вечарам 11 красавіка 1995 года мне патэлефанаваў Зянон Пазьняк і сказаў, што заедзе пасьля пасяджэньня Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце. Па ягоным тоне я зразумела, што ёсьць нейкая сур'ёзная справа.

Ён прыехаў позна, пасьля 12-й ночы, і адразу працягнуў мне паперы, сказаўшы: "Гэта трэба тэрмінова надрукаваць". Сам сеў на канапу і заплюшчыў вочы. (Ён пастаянна недасыпаў, а часам ня спаў зусім, таму быў вельмі стомлены.)

Гэта была заява Апазыцыі БНФ аб абвяшчэньні галадоўкі. Прачытаўшы тэкст, усё ўнутры ў мяне пахаладзела. Калі я скончыла друкаваць, Зянон імгненна расплюшчыў вочы, устаў і, узяўшы надрукаваны тэкст, падаў мне канверт зь лістом і сказаў, каб раніцай я прыйшла ў Вярхоўны Савет у вестыбюль перад уваходам у Авальную залю пасяджэньняў, адкуль будзе чуваць, пра што гаворыцца ў залі. Калі я пачую заяву пра абвяшчэньне галадоўкі, я павінна адразу ж паехаць у Інстытут фізікі АН Беларусі і аддаць гэты ліст Ю. Хадыку. "У лісьце, — патлумачыў Пазьняк, — паведамленьне пра галадоўку і пра далейшыя дзеяньні Фронту".

Будучую галадоўку мы не абмяркоўвалі. Зянону трэба было ехаць дахаты і хоць гадзіну адпачыць перад заўтрашнім днём. А ўжо было каля дзвюх ночы.

(Значна пазьней я даведалася, што ў лісьце было распараджэньне старшыні Фронту Зянона Пазьняка свайму намесьніку Ю. Хадыку пра дзеяньні БНФ, у тым ліку зьбіраць фронтаўцаў на плошчу Незалежнасьці ў падтрымку галадуючым дэпутатам і ў знак пратэсту супраць незаконных дзеяньняў выканаўчай улады.

Адбылося ўсё з дакладнасьцю наадварот. Калі потым людзі самі стыхійна сабраліся на плошчы Незалежнасьці, менавіта Ю.Хадыка заклікаў усіх разысьціся па хатах.

Адыходзячы, Зянон яшчэ папрасіў мяне назаўтра вечарам зьезьдзіць да ягонай маці Ганны Яўхімаўны, перадаць ёй ліст і (калі я змагу) нават заначаваць у яе, каб як-небудзь зьменшыць ёй удар ад зьвесткі пра галадоўку.

Нараніцы, як і было дамоўлена, здаецца, а 9-й гадзіне, я падышла да правага крыла Дома ўрада і нечакана сустрэла Генадзя Грушавога, які хуткім крокам выходзіў з будынка. Ведаючы, якія падзеі насьпяваюць, я вельмі зьдзівілася (бо Генадзь быў сябрам Апазіцыі БНФ) і спытала: "Як там?"

—Зьбіраюцца зачытваць заяву, — скарагаворкай вымавіў Генадзь і, не прыпыняючыся, шпарка пайшоў ад Вярхоўнага Савета.

Я ўвайшла ў будынак, прад'явіла білет дэпутата Менгарсавета, і дзяжурныя міліцыянты прапусьцілі мяне без перашкодаў. У вестыбюлі перад Авальнай заляй было пуста, толькі раз-пораз праходзілі дэпутаты. Зь некаторымі я перамовілася пра сітуацыю ў залі. Пачуўшы заяву пра абвяшчэньне галадоўкі, я хутка накіравалася зь лістом у Інстытут фізікі.

Спадар Хадыка прачытаў ліст, які (як мне падалося) яго ніяк не ўсхваляваў. Ён толькі сказаў, што трэба зьбіраць Управу (я была сябрам Управы БНФ), і я паехала ў сядзібу. Там мы арганізавалі збор коўдраў, спальных мяшкоў (каб ноччу дэпутатам было чым накрыцца ў Авальнай залі), купілі мінеральную ваду, я ўзяла маленькі пераносны тэлевізар і мы зь Юзікам Такушэвічам павезьлі ўсё гэта ў Вярхоўны Савет.

"Зьвязуючым" Апазіцыі і Фронту была ў гэтай сітуацыі дэпутат Апазіцыі БНФ Галіна Сямдзянава. Ёй мы перадалі ўсё, што прывезьлі, зь ёй перамовіўся Ю. Хадыка, яна ж перадала мне запіску ад Зянона.

Тым часам на плошчы Незалежнасьці стыхійна зьбіраліся людзі. Яны чакалі каманды, чакалі зьвестак. Там я доўга не затрымлівалася (сьпяшалася выканаць просьбу З. Пазьняка), але памятаю, што Ю. Хадыка і В. Івашкевіч кіравалі на плошчы і скіроўвалі людзей дадому.

Я паехала да Ганны Яўхімаўны. Мы доўга зь ёй размаўлялі (яна яшчэ ня ведала сітуацыі ў Вярхоўным Савеце). На душы ў мяне было вельмі трывожна. Вечарам, а 21—22-й гадзіне, патэлефанаваў Зянон, сказаў, каб мы не хваляваліся, што ўсё будзе добра.

Але трывога не зьмяншалася і, як потым стала вядома, не дарэмна. Ноччу адбыліся падзеі, якія ўзрушылі ўвесь сьвет — зьбіцьцё дэпутатаў у будынку Вярхоўнага Савета. Дэпутатаў, якія па закону зьяўляліся асобамі недатыкальнымі! Гэта падзея ўскалыхнула многіх. Тэлебачаньне, радыё шмат якіх краінаў сьвету перадавалі пра небывалае парушэньне права і закону рэжымам Лукашэнкі. Лукашэнка ня проста парушыў Закон. Гэтай ноччу ён увёў войскі ў парлямант, пайшоў на злачынства, бо ўсе страшныя падзеі ў Авальнай гэтай ноччу рабіліся зь яго загаду.

Нараніцы я ад Ганны Яўхімаўны прыехала ў Гарсавет на працу і даведалася (здаецца, ад Вольгі Кузьміч), што ноччу дэпутатаў зьбілі ваенныя і вывезьлі невядома куды. Потым прыйшлі весткі, што дэпутаты Апазіцыі даюць прэс-канфэрэнцыю ў Вярхоўным Савеце. Разам з Вольгай Кузьміч мы бягом пабеглі туды, дзе і даведаліся пра страшныя начныя падзеі. Зьбітыя і змучаныя дэпутаты распавялі пра тое, што адбылося.

Мы з Вольгай вярталіся ў Гарсавет і ўсю дарогу плакалі. Каля прыступак Гарвыканкама стаялі людзі. Яны прыйшлі даведацца, што здарылася з дэпутатамі (пра прэс-канфэрэнцыю ведалі, зразумела, нямногія). Людзі хваляваліся. Нехта з чыноўнікаў Гарвыканкама хлусіў, што ўсё спакойна, нічога, маўляў, ня здарылася і прасіў разыходзіцца.

Пачуўшы гэтую хлусьню, я пачала з тых прыступак без мегафона гаварыць тое, пра што даведалася сама. Прахожыя прыпыняліся, слухалі. Сабраўся даволі вялікі натоўп. Раптам зьявіліся міліцыянты і пачалі выцясьняць нас ад уваходу ў Гарвыканкам. Яны не чапалі людзей, ня білі (хоць такія паводзіны міліцыі былі ўжо не за гарой), але сілай адпіхвалі людзей да вугла праспекта Скарыны і вуліцы Сьвярдлова (рог будынка Гарвыканкама).

Тут да нас далучыўся дэпутат М. Кобаса. Мы разам спрабавалі спыніць міліцэйскае самаўпраўства (бо людзі нічога не парушалі, не крычалі і нікому не перашкаджалі, а толькі маўкліва слухалі). Твары міліцыянтаў не былі агрэсіўнымі, але нейкія каменныя. Ні на што не зважаючы, яны рабілі, што ім, відаць, было загадана: адпіхвалі людзей.

Вечарам, гадзінаў у шэсьць, мы сабраліся ў сядзібе БНФ. Запомніліся стомленыя і няголеныя твары дэпутатаў Апазіцыі БНФ С.Антончыка, Ул.Заблоцкага, С.Герменчука, якія шмат перажылі за апошнія суткі. Пазьняка не было.

Што мяне вельмі ўразіла ў тыя хвіліны, гэта нейкае раўнадушша "сядзібнай рэшты" кіраўніцтва Фронту, асабліва В.Івашкевіча і В.Вячоркі (так мне запомнілася), некаторых сяброў Управы. Абсалютна выразна памятаю, што спачуваньня дэпутатам і абурэньня начным нападам на Вярхоўны Савет не было. У галаве круцілася думка: "Няўжо ніхто не разумее, што адбылося?"

Гэта выглядала вельмі дзіўна. Я падышла да дэпутата Апазіцыі БНФ Ігара Герменчука, спытала пра Зянона. Ігар сказаў, што Пазьняку дасталася ад "гарылаў" найбольш, што яго білі моцна і што зараз ён у Вярхоўным Савеце (па вул. К. Маркса).

Я бягом памчалася ў Вярхоўны Савет. Пазьняк быў у сваім дэпутацкім пакоі. Тут у кабінет заходзіць Ігар Лучанок. Ён быў (я не магла паверыць) на добрым падпітку, і ўсё гаварыў, што яны з Зянонам напісалі геніяльны раманс (на верш Зянона "Гучаньне анельскага голасу"). "Я тут ні пры чым, — кажа Пазьняк, — гэта ваша музыка геніяльная". "Мы напісалі геніяльны раманс", — зноў паўтараў вясёлы Лучанок. "Гэта таму што вы — геній", — кажа Пазьняк. "Зянон Станіслававіч, я — за вас. Быў і буду заўсёды,— кажа на гэта Лучанок, — гэта вы геній". "Я не Яўгеній, я Зянон",— кажа Пазьняк і г. д.

Вясёлая сцэнка вярнула мяне да раўнавагі і, калі Лучанок пайшоў, я стала раіць Пазьняку зьвярнуцца да лекара. Але ў той сітуацыі займацца асабістым здароўем Пазьняк ня стаў. Ён казаў, што нічога страшнага. Прайшоў час, і толькі тады я даведалася, што гэта былі ўсяго толькі словы адгаворкі, што на самай справе ўсё было зусім іначай. Некалькі гадоў балела рука і плячо, і гэты боль часам схаваць было немагчыма.

ВЫБАРЫ 1995 ГОДА

Пра іх успамінаць, бадай, найцяжэй. Памятаю нашыя пасяджэньні, абмеркаваньні фронтаўскіх кандыдатураў у Вярхоўны і мясцовыя саветы. Усё ішло як быццам па-ранейшаму. Але ў хуткім часе стала відаць, што тут ужо зусім іншая сітуацыя. Гэта ўжо былі іншыя выбары, чым у 90-м годзе, калі мы ўсе былі як адна адзіная каманда.

Для мяне сітуацыю "праясьніла" супрацоўніца Управы БНФ, якая з радасьцю расказала, называючы пайменна цэлую групу фронтаўцаў (кандыдатаў ад Фронту!), якія атрымалі добрыя грошы на "сваю" выбарчую кампанію (адкуль — не сказала). Таму ў іх асабіста было шмат агітацыйных матэрыялаў, плякатаў, лістовак, мастацкіх кніжак (якія яны бясплатна раздавалі на сваіх пікетах, каб "прывабіць" да сябе выбаршчыкаў) і шмат чаго яшчэ. Супрацоўніца не хавала таго, як "добра стала" ўсёй іхняй камандзе, што яны езьдзяць у асноўным на таксі, добра харчуюцца і г.д. "Вось гэта ўжо і ёсьць падстава карупцыі, — падумала я. — Гэтых нельга пускаць ва ўладу".

Ці маглі мы перамагчы ў выбарах 1995 года? Мы мелі вялікую падтрымку выбаршчыкаў. Машына фальсіфікацыяў працавала, але супрацьстаяць ёй тады было яшчэ магчыма. Патрэбна была згуртаванасьць, скаардынаванасьць, адчуваньне адзінага фронтаўскага пляча. Хцівасьць асобнах людзей, памножаная на амбіцыі і індывідуалізм аўтсайдэраў, аслабілі наш адзіны кулак. Як паказалі нашыя назіраньні за выбарамі (нашыя падлікі галасоў, кантроль за выбарамі), шмат каго з кандыдатаў ад Фронту выбаршчыкі падтрымалі. Але рэжымам незаконна было зроблена ўсё, каб ніхто з фронтаўскіх кандыдатаў ні ў Вярхоўны, ні ў мясцовыя саветы ня трапіў.

Рэжым не шкадаваў нічога, каб не дапусьціць да прадстаўнічай улады адраджэнцаў. Смаргонская ж акруга Зянона Пазьняка кантралявалася рэжымам татальна, лукашэнкаўскія памагатыя працавалі дзень і ноч, каб увесьці ў зман выбаршчыкаў. І "альтэрнатыву" Пазьняку падшукалі адпаведную — мясцовага лекара, бо пралічылі, што рэйтынг лекараў на выбарах павінен быць найбольшы.

Калі-нікалі сапраўды можна было пачуць "аргумэнтаваныя" разважаньні некаторых наіўных смаргонцаў: "Я буду галасаваць за лекара, бо ён лечыць нашых дзетак", — як быццам у Вярхоўным Савеце той лекар павінен быў бы не законы прымаць, а лячыць сваіх смаргонцаў у Авальнай залі. Дзівакі. Але сьведамых выбаршчыкаў было ўсё роўна больш, і рэжым гэта ведаў.

Тады вечарам апошняга агітацыйнага дня перад выбарамі па БТ рэжым дэманструе спэцыяльна адзьняты фільм-фальшыўку, паклёп на Фронт і Пазьняка. Самым гнюсным і подлым чынам (лукашысты іншых мэтадаў проста ня ведаюць) быў зроблены мантаж. На экране паказвалі выступы і прамовы гітлераўскіх фашыстаў (кадры ваеннай кінахронікі), а за кадрам гучэў голас Зянона Пазьняка. Выходзіла, што гітлераўцы прамаўлялі голасам Пазьняка, кадры мітынгаў БНФ былі зманціраваныя з фашысцкай кінахронікай з адпаведным камэнтаром аўтараў фільма і г.д.

Калі я глядзела гэтую гнюснасьць, у мяне ня ўзьнікла ніякай трывогі, бо фальш быў настолькі відавочны, што я ўнутрана сьмяялася над прымітыўнасьцю "аўтараў". Толькі я, аказваецца, памылялася і пазьней пераканалася ня раз, што ў жыцьці, на жаль, заўсёды знаходзяцца наіўныя людзі, гатовыя паверыць любой небыліцы. На гэтым якраз і будавалася гёбельсаўская і гэбоўская прапаганда.

Але, нягледзячы на такі сканцэнтраваны паклёп, у 1995 годзе З.Пазьняк зноў быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета, аб чым сьведчылі фронтаўскія апытаньні, назіраньні на выбарчых участках за ходам галасаваньня і падлікам галасоў. Тады рэжым уключыў у "справу" фальсіфікацыйную машыну і абвесьціў, што выбары па акрузе Зянона Пазьняка не адбыліся, не хапіла, маўляў, да кворуму некалькі сот галасоў. Тады Пазьняк знайшоў 500 няўлічаных галасоў. Праверка ЦВК пацьвердзіла гэта. І тады старшыня ЦВК Абрамовіч (сьціраваўшы вочы ў кут) наадрэз адмовіўся прымаць рашэньне. Пракуратура адмовілася разглядаць пытаньне. На двары ўжо быў лукашызм. Не клапаціліся нават пра фармальнасьці. Аналягічным чынам выкідвалі з выбараў іншых фронтаўцаў (быў загад Лукашэнкі: "Ни одного бэнээфовца").

Такім чынам на гэты раз дэпутатамі ад Фронту ня стаў ніхто: і сапраўдныя ахвярныя змагары за Беларусь, і нешматлікія яшчэ тады імітатары, якім проста вельмі хацелася называцца дэпутатамі (якія потым, дарэчы, скарыстаўшы новую сітуацыю, пачалі "рабіць грошы" на сьвятой справе змаганьня).

«ВЫБАРЫ» «ВЕРТЫКАЛІ»

Стала вядома, што А.Лукашэнка зьбіраецца будаваць "вертыкаль". У Гарсавеце паведамілі, што на бліжэйшай сэсіі дэпутатаў мы павінны будзем зацьвердзіць прапанову Лукашэнкі на пасаду старшыні Гарвыканкама (якую дагэтуль займаў выбраны дэпутатамі А.М.Герасіменка). Кандыдатура трымалася ў сакрэце да самай апошняй хвіліны, і ніхто з дэпутатаў ня ведаў, застанецца А.Герасіменка ці будзе прапанаваны хтось іншы. Сярод дэпутатаў быў рашучы настрой пакінуць Герасіменку, бо ў існуючай палітычнай сітуацыі ён задавальняў большасьць дэпутатаў. Чалавек інтэлігентны, выхаваны, ён умеў сябе паводзіць зь людзьмі, у ім не было савецкага кіраўнічага хамства, характэрнага стылю кіраўнікоў былой намэнклятуры. (У астатнім ён, як і іншыя, служыў рэжыму.)

На пасяджэньне сэсіі Лукашэнка пазьніўся. Усе чакалі. Калі ён зьявіўся ў суправаджэньні сваёй аховы (яны ішлі хутка, не зважаючы ні на каго), іх вельмі ветліва сустрэў А.Герасіменка каля свайго кабінета і запрасіў да сябе. (У той момант я якраз была на трэцім паверсе і магла назіраць, як да Лукашэнкі кінуўся Герасіменка і як Лукашэнка, амаль не зважаючы на яго, як гаспадар, рэзка прайшоў у прыёмную (відаць, каб распрануцца).

Ці паведаміў ён А.М.Герасіменку пра ягоны лёс як старшыні Гарвыканкама, мне невядома. Аляксандр Міхайлавіч прыйшоў у залю пасяджэньняў Гарсавета напужаны, бледны, у прыгнечаным настроі.

Вялікая заля сэсіі Гарсавета была напоўненая бітком. Усе праходы былі запоўненыя журналістамі. Яблыку ўпасьці не было куды. У Прэзідыюме сядзелі А.Герасіменка (вядучы сэсіі), Лукашэнка і, здаецца, яшчэ нехта. Працэдуры запрашэньня госьця сэсіі Менгарсавета А.Лукашэнкі не было: прыйшоў і сеў сабе.

Пачалося пасяджэньне. Лукашэнка аб'явіў кандыдатуру Ярмошына. Заля охнула (усё ж чакалі, што Герасіменка застанецца). Падчас свайго выступу Лукашэнка вёў сябе нахабна, гаварыў, самаўпэўнена і грэбліва да думкі дэпутатаў. (Па закону — старшыня Гарвыканкама выбіраецца дэпутатамі на сэсіі. Лукашэнка зламаў права і закон і пастанавіў асабіста прызначаць кіраўнікоў. Фармальна мы павінны былі прагаласаваць, але ніякай перашкоды ўзурпацыі ўжо зрабіць было немагчыма.)

Яго расейская мова была малапісьменная, выяўляла думаньне прымітыўнага чалавека. Ён самаўпэўнена давёў да нашага ведама, што мы прагаласуем за яго кандыдатуру. Калі ж не — нашае дэпутацкае рашэньне для яго значэньня ня мае, бо тады ён "вертыкальнага" прызначыць, а Гарсавет распусьціць.

Гэта быў нахабны выклік законнасьці. І калі б дэпутацкі склад быў іншым, можна было б змагацца з узурпатарам. Але дэпутаты маўчалі, як маўчала грамадства, калі Лукашэнка зьневажаў нашу родную мову, зьневажаў беларускі народ, наш Сьцяг і Гэрб, нашу Канстытуцыю...

Калі пачаліся пытаньні да Лукашэнкі, я падышла да мікрафона і падняла руку. І зноў, як і на незаконным сходзе работнікаў адукацыі, на мяне з маленьнем паглядзеў вядучы А.Герасіменка. Жэсты і міміка яго выказвалі вялікую просьбу да мяне не выступаць. Я настойвала. І Аляксандр Міхайлавіч, як і тады, на сходзе, даў мне слова. І зноў выгляд яго быў такі, як бы ён у другі раз падпісаў сабе прысуд.

Я зьвярнулася да Лукашэнкі і нагадала яму, што тут, на сэсіі Гарсавета, ён госьць, а не гаспадар у сваёй хаце, таму мы патрабуем ад яго весьці сябе паважліва да дэпутатаў. Заля зноў охнула, зашчоўкалі фотаапараты, відэакамэры. Я прадаўжала: "Вашыя зьняважлівыя выказваньні супраць беларускай мовы характарызуюць вас, а не беларускую мову. Як грамадзянка Беларусі выказваю вам свой пратэст і абурэньне. Як бы вы ні стараліся зьнішчыць беларускую мову, гэтага вам ня ўдасца. Беларуская мова жыве тысячу гадоў, яна перажыла не адну навалу, перажыве і сёньняшнюю. А вам я скажу як спэцыяліст, як настаўніца рускай мовы: вы размаўляеце па-расейску вельмі дрэнна. Гэта не да твару асобе на такой пасадзе. Таму параю вам узяць рэпетытара і добра павучыцца, і па-беларуску, і па-расейску. Я гатова даць вам некалькі лекцыяў, калі ў вас будуць цяжкасьці".

Я разумела, што гавару недапушчальна рэзка, што гэта ня той стыль і тон, якім размаўляюць з прэзідэнтам, але ў дадзеным выпадку трэба было гаварыць менавіта так жорстка і ледзяным голасам, з калгаснай прасталінейнасьцю, каб зьбіць зь яго гэтую плебейскую спесь. Іншай мовы ён проста не ўспрыняў бы.

Відаць, я не памылілася. У Лукашэнкі, здаецца, быў шок. Ён неяк крыва ўсьміхнуўся і няўдала стараўся перавесьці ўсё ў жарт: "Ну ничэво, мы ещо с вами паработаем в одной камандзе". Я з упэўненасьцю адказала: "З вамі, спадар Лукашэнка, у адной камандзе я ня буду ніколі".

Заля назірала, адкрыўшы раты. Тым часам нехта ўслужліва падбег да вуха Лукашэнкі і "доложил обстановку". Тады той разгублена прамычэў (бо ніякага адпору на сэсіі ён ня толькі не чакаў, але і ўявіць сабе ня мог): "Ну, да, конечна, у вас есть свой презідзент..."

Зьнявага з боку Лукашэнкі ўсіх нас, дэпутатаў, была настолькі хамаватай, што трэба было абараняць годнасьць, спыніць зьневажальніка. Так не павінна было заставацца. Сэсія Гарсавета давала магчымасьць выказаць публічна Лукашэнку маё абурэньне ягонай палітыкай зьнішчэньня Беларусі.

Калі У.Ярмошын (як кандыдат-"вертыкальшчык") пачаў адказваць на пытаньні дэпутатаў, да мікрафона падышоў дэпутат Камісіі па адукацыі Сяргей Гошка. Настаўнік матэматыкі, ён толькі вучыўся гаварыць па-беларуску і публічна выступаў па-руску. Ён ня быў у Народным Фронце, але відавочна быў прыхільнікам беларускага Адраджэньня. Ён заўсёды абараняў беларускую мову і заўсёды патрабаваў выкананьня Закона аб мове ад чыноўнікаў Гарвыканкама.

Дэпутат С.Гошка задае пытаньне сп.Ярмошыну: "Вы зьбіраецеся кіраваць сталіцай Рэспублікі Беларусь. Як кіраўнік Менска, як бы вы аднесьліся да наступнага выказваньня?" І ён зачытаў цытату з газэты, сэнс якой прыкладна такі: "Белорусский язык — язык ограниченных возможностей. Существуют только два языка, на которых можно выразить абсолютно всё. Это русский и английский".

Заля прыціхла. Ярмошын зьдзіўлена паглядзеў на дэпутата (відаць, рашыў, што зь ім нешта ня так), паціснуў плячамі і сказаў: "Это какая-то глупость, и сказать ее мог какой-то дурак".

Здавалася, што ў залі ўзарвалася бомба — рагаталі ўсе, нават Лукашэнка выціснуў з сябе ўсьмешку, бо калі хто ў Беларусі і ня ведаў, што гэта была цытата з выказваньняў Лукашэнкі, то, відаць, толькі адзін Ярмошын, які стаяў разгублены і не разумеў, што адбываецца, чаму такая рэакцыя на ягоны абсалютна нармальны адказ.

Калі заля крыху супакоілася, Ярмошын сур'ёзна адказаў, што беларуская мова дзяржаўная, і ён будзе яе падтрымліваць. І трэба сказаць, што адкрыта супраць беларускай мовы ў тыя часы сп.Ярмошын не выступаў. Дапамагаць Лукашэнку разбураць незалежную Беларусь ён стараўся з іншага боку. Напрыклад, 24 сакавіка 1996 г. ён быў адзін з кіраўнікоў нападу спэцсілаў на дэманстрантаў (што пратэставалі супраць падпісаньня "саюзнай" дамовы Ельцына — Лукашэнкі) у Менску каля будынку тэлебачаньня.

ШЧАСЬЛІВЫЯ ЗЬМЕНЫ Ў АСАБІСТЫМ ЖЫЦЬЦІ

У ліпені 1995 года ў нашым асабістым жыцьці адбылася шчасьлівая падзея: у касьцёле Сьвятога Станіслава ў Магілёве мы з Зянонам узялі шлюб. Калі ксёндз абвясьціў, што будзе адбывацца шлюб Зянона Пазьняка і мы пайшлі поруч праз увесь касьцёл, вернікі (якіх было поўная сьвятыня) стоячы віталі нас апладысментамі.

На той час я яшчэ знаходзілася на шляху станаўленьня сваёй веры і пад уплывам Зянона яшчэ толькі "ішла да Бога", але сьвяточны абрад Боскай Таямніцы закрануў маю душу і Боскую Далонь над нашымі галовамі буду памятаць да канца. У тыя імгненьні я адчувала прысутнасьць Бога, які злучаў нашы лёсы назаўсёды.

З намі былі блізкія сябры: Анатоль Трыпуцін, Вольга Кузьміч і яе (сьветлай памяці) муж Васіль, Валянціна і Юзік Такушэвічы і наша Надзейка.

Мы выехалі зь Менску а 6-й раніцы і паехалі ў Магілёў у старажытны і прыгожы касьцёл. Ля касьцёла мы прыпыніліся, каб выйсьці з машыны, як з 5-га ці 4-га паверху дома побач з касьцёлам пачуўся дзікі лямант. Злосна з перакошаным ад нянавісьці тварам і вар'яцкімі вачыма крычэла на нас і апантана размахвала рукамі ў расчыненым насьцеж акне нейкая невядомая нам жанчына, паносячы нас на чым сьвет стаіць. Яна беснавалася. Гэта было дзіўна, бо ніяк не было абгрунтавана, пра наш прыезд ня ведаў ніхто, а лямант пачаўся, калі мы яшчэ былі ў машыне і нас ніхто не пасьпеў убачыць.

Зянон неяк доўга задумліва паглядзеў на яе. Потам на мяне. Мы накіраваліся да касьцёла, і Зянон пытае:

— Ты не спалохалася?

— Не. А што, гэта дрэнна?

— Што?

— Гэтая баба.

— Ды не, добра.

— А чаму добра?

— Сатана шалее ад злосьці, што мы спаткаліся, — сказаў Зянон, — на дарозе ў храм, — і ўсьміхнуўся.

Я думала, ён жартуе. А ў Касьцёле на каленях побач прад алтаром я адчула над сабой прысутнасьць Духа. Мая душа сталася як частка Нечага і трымцела.

Гадоў праз дзесяць цяжкага жыцьця і змаганьня на чужыне, калі самім ня верылася, як гэта мы вытрымалі і трываем, Зянон аднойчы спытаў мяне:

— Ці адчуваеш ты Боскую Далонь над нашым лёсам?

— О так, адчуваю, — кажу я, — увесь гэты час, усе гэтыя пакутныя гады...

Пасьля шлюбнага абраду ксёндз Блін запрасіў нас з сябрамі на абед, і мы з удзячнасьцю прынялі такое ганаровае запрашэньне.

Перад ад'ездам з Магілёва мы патэлефанавалі старшыні Магілёўскай фронтаўскай арганізацыі Анатолю Фёдараву, і ён імгненна зьявіўся. Пра шлюб ён нічога ня ведаў. Анатоль глядзеў на нас і нічога не разумеў.

— А чаго гэта вы такія ўрачыстыя? І ты, Галя, у блакітнай сукенцы, як нявеста.

— Я і ёсьць нявеста, — кажу.

— Гы-гы-гы, — пасьмяяўся разгублены Анатоль.

— А хто жаніх? — паварочваецца ён да Пазьняка, недаверліва ўсьміхаючыся.

— Ён перад табой, — кажа Пазьняк.

— Гы-гы-гы, — толькі і вымавіў Анатоль і, памаўчаўшы, дадаў: — Ну хопіць, праўда, ну хто?

— Табе ж кажуць — Зянон, — сьмяецца Вольга.

— Ну, кіньце вы мяне разыгрываць, — кажа, нібы пытаецца, Анатоль.

Мы ўсе пачалі рагатаць, бо, гледзячы на Анатоля, стрымацца было немагчыма. Ён вельмі баяўся сьмешна выглядаць, "купіўшыся" на жарт, і ад гэтага выглядаў яшчэ больш сьмешна. Анатоль глядзеў на нас, часаў патыліцу і не здаваўся. Ён ніяк ня мог паверыць, што мы не жартуем, і вельмі не хацеў аказацца "ў дурнях".

Усе доўга сьмяяліся. Калі, нарэшце, да Анатоля дайшло, што гэта ня розыгрыш, ён толькі сказаў "а-а-а" і, не разьвітваючыся, пабег да тэлефона, бо пра гэтую навіну яшчэ ніхто ў Фронце ня ведаў.

А мы тым часам паехалі па нашай Магілёўшчыне і потым — Меншчыне зь яе найпрыгажэйшымі краявідамі на высокі бераг Беразіны, і там, у цудоўным нашым месцы, на гары, у сьветлым сасновым лесе, каля ракі адсьвяткавалі Наш дзень. Надвячоркам Зянон сказаў ехаць у нейкім накірунку аднаму яму вядомымі дарогамі. Ехалі доўга асфальтам, потым прасёлачнымі, заехалі ў нейкія таямнічыя мясьціны (у чыё гэта княства?). Неўзабаве і зусім з дарогі зьехалі. Зянон сказаў спыніцца, усім пачакаць у машыне, а мне выходзіць разам зь ім, узяў мяне за руку і павёў. Неўзабаве я ўбачыла велізарны, мэтры са два ў вышыню, конусападобны, як егіпецкая параміда, камень зь неглыбока выдзеўбленым вялікім крыжам на гладкім баку. Зянон паклаў на камень ля крыжа руку і кажа: "Гэта Барысаў камень, пра які мала хто ведае. Цяпер будзеш ведаць ты. Датыкайся і думай, што хочаш". Я паклала на камень далонь і падумала, што хацела.

Такое шчасьлівае і незвычайнае вясельле сталася для мяне найлепшым падарункам лёсу. Само сьвята прыдумаў Зянон, і яно найбольш адпавядала нашым душам: касьцёл, сябры, беларуская прырода.

Але пазьней нашая Койданаўская рада вырашыла зрабіць "сваё" вясельле. Нам з Зянонам паведамілі, што мы на гэтай імпрэзе будзем "дзеючымі асобамі". Так у вялікім крузе сяброў мы адсьвяткавалі нашае сьвята яшчэ раз. Былі песьні і жарты, пад агульны сьмех нехта паставіў Пазьняка перад праблемай, што цяпер ён павінен "напісаць заяву" ў Койданаўскую раду. Усе былі вясёлыя, казалі нам цёплыя словы і шчыра радаваліся за нас.

У Гарвыканкаме, дзе я тады працавала, падзея нашага асабістага жыцьця не прайшла без увагі.

Мяне віншавалі на працы супрацоўнікі, старшыня Выканкама і Гарсавета А.М.Герасіменка і яго намесьнікі. Віншавалі шчыра, радуючыся за нас з мужам. Вельмі прыхільна напісалі пра навіну амаль усе газэты, сардэчна павіншавалі нас. Не абышлося і бяз гумару. Дыктар Тэлебачаньня, напрыклад, у манеры Левітана "ад савецкага Інфармбюро", чаканна паведамляў, нагнятаючы інтанацыю: "Сёньня, 23-га ліпеня 1995 года, у горадзе Магілёве, у касьцёле сьвятога Станіслава..." і г. д. Можна было падумаць, што пачалася вайна ці яшчэ што неверагоднае.

Цяпер, калі я ўспамінаю, мне часам здаецца, што гэта быў сон, які некалі можна ўбачыць ізноў.

СЯБРА СЯРГЕЙ НАВУМЧЫК

Неўзабаве пасьля нашага шлюбу Зянон выехаў у камандзіроўку, а назаўтра Беларусь даведалася, што ня стала Максіма Танка. Людзі ішлі ў Дом літаратара разьвітацца з Народным паэтам. Там былі ўсе: і хто любіў Беларусь, і хто яе ненавідзеў. Зянона ў Менску не было, але ніхто пра гэта ня ведаў. Я зьбіралася з Гарсавета пайсьці на разьвітаньне адна, але гэта выглядала ня надта добра. І тут раптам мне патэлефанаваў Сяргей Навумчык і сказаў скарагаворкай: "Галя, я зараз пад'еду ў Гарсавет, і мы разам паедзем у Дом літаратара".

Гэта быў рух сяброўскай душы, якая ўсё разумее і якой ня трэба нічога тлумачыць. Увогуле, Сяргей заўсёды ўмеў з'арыентавацца, каб падставіць плячо. Так адбывалася ня раз і на прыёмах замежных амбасадараў. Калі сітуацыя вымагала нейкія перамовы мужа, Сяргей заўсёды ўмеў "апынуцца побач", каб я (жонка вядомага палітыка) не заставалася стаяць адна сярод чужых людзей. Ён быў і надалей застаецца нашым сябрам, які ніколі ня здраджвае. Ён можа на нейкі час "зьнікнуць" з поля зроку, але мы заўсёды ведаем, што Сяргей — сапраўдны сябра.

Неяк аднаго разу мы зь ім размаўлялі па тэлефоне, і Сяргей, каб перапыніць нейкую нашую спрэчку, ляканічна сказаў: "Ведаеш, я добра ўсьведамляю, што такое Пазьняк для Беларусі". І гэта праўда, як праўда і тое, што Сяргей добра разумее значэньне кожнай асобы, якая ахвяруецца дзеля Бацькаўшчыны.

Мне вядома таксама, што гэткай жа добрай думкі пра Сяргея Навумчыка быў і Васіль Уладзімеравіч Быкаў. Сяргей быў адзін зь нямногіх, хто вельмі падтрымліваў нашага дарагога Васіля Уладзімеравіча ў апошнія гады яго жыцьця і асабліва ў апошнія ягоныя дні.

Сяброўства — гэта Боскі дар, які жыве на Беларусі і дае нам сілы жыць і змагацца.

(Працяг будзе.)



Галадоўка дэпутатаў Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце (1995 г.).

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 КРАСАВІКА 2008 г.

ПАМЯЦЬ

Яны застаюцца жыць

Гонарам і годнасцю Беларусі ўвайшлі ў памяць сумленных людзей славутыя дочкі Айчыны, чыя дзейнасць служыла дабру і святлу на роднай зямлі. Сёння, на шчасце, да славутых імён мінулага — такіх як Элаіза Пашкевіч (Цётка), Зоська Верас, Ларыса Геніюш, можна дадаць і імёны нашых сучасніц — змагарак за свабоду Бацькаўшчыны. Я скажу толькі пра дзвюх маіх зямлячак.

Тамара РАМАНЬКОВА, якая працавала выкладчыкам фізікі ў Магілёўскім культасветвучылішчы, у час перабудовы апынулася на пярэднім краі барацьбы за перамены ў нашым жыцці. Свае сілы і грамадзянскі гарт накіравала на захаванне памяці аб тых, хто загінуў у час сталінскіх рэпрэсій, стала адным з заснавальнікаў арганізацыі "Мартыралог Беларусі". На яе сродкі быў устаноўлены першы крыж каля мясакамбіната, дзе ў 30-я гады ішлі расстрэлы людзей. Зараз за кошт спонсарскай дапамогі тут плануецца паставіць помнік. Тамара падтрымлівала стасункі з сям'ёй Сахарава, шмат працавала ў архівах і збірала дакументы для адкрыцця музея рэпрасаваных у Магілёве.

Гэта была цікавая, мэтанакіраваная, яркая жанчына. З ёй я сустракалася не толькі ў час выступленняў на сходах, але і на аднаўленні жаночага манастыра на Падніколлі, а таксама на занятках па вывучэнні Бібліі ў Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце. Цяпер яе няма. Цела Тамары Раманьковай знайшлі праз шэсць месяцаў пасля яе смерці, пахавана яна на машэкаўскіх могілках...

Наталля РОСЛАВА таксама актыўна ўдзельнічала ў дэмакратычных зменах на Беларусі, была дэпутатам абласнога савета, заснавальнікам першых фестываляў "Магутны Божа" ў Магілёве. З яе ўдзелам выйшлі першыя нумары газеты "Ратуша", затым яна выдавала часопіс "Вера і Розум". Наталля сустракалася з айцом Надсанам — епіскапам уніяцкай царквы ў Лондане. Яго багатай беларускай бібліятэкай карыстаюцца навукоўцы і пісьменнікі нашай краіны.

Шмат сіл прысвяціла Наталля арганізацыі "Дзеці Чарнобыля". З яе клопату дзеці забруджаных раёнаў маглі аздаравіцца за межамі Беларусі, пацярпелыя ад аварыі атрымлівалі гуманітарную дапамогу. Я працавала тады ў школах на забруджанай тэрыторыі і добра гэта ведаю...

Светлая памяць аб гэтых цудоўных жанчынах будзе доўга жыць сярод нас. Гісторыя яшчэ дасць сваю адзнаку дзейнасці адданых патрыётак Беларусі.

Ларыса ШУКАЙЛА,
старшыня
Магілёўскага аддзялення
ГА "Беларуская
асацыяцыя ахвяр
палітычных рэпрэсій".

СЛУЧАЙНАЯ ВСТРЕЧА

«Против большевиков — хоть с чертом...»

Интервью с казаком вермахта

Назвать имя этого человека я не могу. Одно из условий интервью — ни имен, ни названия города, в котором мы случайно встретились. Впрочем наверняка его имя и так не настоящее. Такие люди, как он, обычно завещают родственникам выгравировать их настоящее имя на могильной плите после смерти.

— Хочешь, напиши Семен Кузьмич Новогрудский, — предложил он.

— А почему Новогрудский?

— Под Новогрудком на левом берегу Немана казачьи станицы были, — пояснил Семен Кузьмич, — я там весной 1944-го месяц в лазарете после ранения лежал. С медсестрой одной полюбился... Маней звали. Вот до сих пор забыть не могу ни Маню, ни Новогрудок...

В 1941 году "Семену Новогрудскому" только исполнилось 17 лет. Он окончил школу и был отправлен военкоматом в кавалерийское училище.

— Мы проучились три месяца, — вспоминает он, — а потом всех курсантов с преподавателями кинули в степь, с задачей остановить врага во что бы то ни стало...

Семен Кузьмич достал из холодильника начатую бутылку "Абсолюта", разлил по стаканам.

— Ну вот нас и не стало... Давай за них... Помянем ребятишек, — поднял свой стакан бывший курсант кавалерийского училища. — У нас оружия-то было — одна трехлинейка на пять человек! А у немцев танки... Из пятисот в живых осталось 70. И те, кто ранен, кто контужен, в плен попали.

Нашим взводом командовал инвалид — преподаватель тактики. Ногу он в гражданскую войну потерял. Немцы, как увидели его, колченого, долго смеялись и даже в плен брать не стали. Домой отпустили. А нас — в лагерь для военнопленных.

— Что было дальше? Как вы к немцам на службу попали?

— Дальше был лагерь, потом снова лагерь и опять лагерь. Однажды приехали к нам русские... в немецкой форме. От генерала Краснова. Говорят: кто из казаков, вступайте в казачьи формирования вермахта. Освободим, дескать, Отечество от большевистского ига. Я и пошел. Мне только исполнилось 18. Советская власть не принесла моей семье ничего хорошего. Деда раскулачили, сослали в Сибирь, отец погиб где-то на стройках пятилетки, куда попал не по своей воле... Ради чего или кого я должен был гнить в лагере? Ради Сталина, который мою семью уничтожил? Или ради коммунизма, о котором нам уши прожужжали? Ну и где он, этот коммунизм? Где страна, за которую столько народа угробили? Кому принадлежат те фабрики-заводы, которые строились на костях наших отцов? Народу принадлежат?

Когда Гитлер пошел войной на Советы, многие верили, что он несет освобождение от большевизма. Для белоэмигрантов и их детей, основавших "Русский корпус", война против СССР на стороне немцев была продолжением "белой борьбы". Генерал Врангель говорил: "Против большевиков — хоть с чертом". Старые белогвардейцы, большинство из которых воевали в Первую мировую войну против немцев, душевно мучились, решая, поддержать Германию в войне против СССР или нет. Ведь немцы никогда не были союзниками русских. Всегда врагами! Но Врангель, да и Колчак ведь завещали: "Против большевиков — хоть с чертом!" Тем более что никто из "западной демократии" не планировал в ближайшее десятилетие воевать со сталинским режимом. Вот они и пошли с Гитлером освобождать Россию от большевизма. Впрочем, Гитлер тоже не доверял белоэмигрантам, поэтому, разрешив создать "Русский корпус", отправил их не на Восточный фронт, а в Югославию — охранять железнодорожные мосты...

— А где вы служили и как оказались в Беларуси?

— Оказался в составе 30-й ваффенгренадерской дивизии СС, которая еще называлась штурмовой бригадой "Беларусь". Служил в кавалерийском дивизионе — гонял партизан по белорусским лесам... Защищал народ от этих "мстителей", их террора.

— Какой же смысл партизанам терроризировать народ, если они — плоть от плоти этого самого народа?

— А я, по-твоему, марсианин? Вот вас научили жонглировать словом "народ". Что такое народ? Однородная масса? Нет! Чекисты, нквдэшники тоже народ. А ведь именно они террором и промышляли... По заданию Сталина, который сказал, что "не может советский народ жить мирно на оккупированной врагом территории, и если население мирно уживается с врагом - значит, это предатели и изменники Родины". Донести мнение вождя до мирного населения оккупированных территорий как раз и должны были офицеры НКВД, десантированные в белорусские и украинские леса...

Что касается немецкой политики в Беларуси — тот же гауляйтер Кубе старался наладить мирную жизнь, восстановить какие-то предприятия, которые могли бы производить продукцию, нужную армии. К примеру, завод по производству фанеры в Мостах. Когда-то эта фанера имела стратегическое значение — из нее делали крылья для самолетов типа "кукурузник". Администрация Кубе пыталась восстановить предприятие, поднять сельское хозяйство, заставить снова работать колхозы. Потому немцы и не раздавали землю, чем и разочаровали крестьян. Ведь народ надеялся, что немец вернет им все, что отняли большевики. Но немцам был важнее не крестьянский интерес, а интересы обеспечения всем необходимым воюющей армии. С этой целью они пытались привлекать к сотрудничеству председателей колхозов, секретарей райкомов, директоров предприятий — по мнению немцев, только эти люди способны были запустить маховик старой системы, но под новым флагом, снова взять в кулак мирное население и заставить его работать на нужды вермахта.

С этой же целью Кубе внедрял в Беларуси принципы местного самоуправления. Немецкая администрация предоставляла автономию целым районом, взамен требуя лишь лояльности к новой власти и поставки продуктов питания, древесины, торфа. Если есть маслобойня — давай масло, мельница — муку... И все. И живи мирно, никаких карательных акций! Никакого насилия. Зачем же резать корову, которая дает молоко? Местное население такие взаимоотношения с новой властью вполне устраивали, но не устраивали Москву. Потому-то первостепенной задачей партизанских отрядов и была дестабилизация мирной жизни населения в тылу врага... Они немало натворили в районах с местным самоуправлением. К примеру, под Полоцком был район, который называли "Республика Зуева". В эту "республику" входило около десятка деревень. Главным там был старовер по фамилии Зуев. Он не подчинялся ни немцам, ни партизанам. Точнее, с немцами у него был договор, согласно которому "республика" поставляла в Полоцк столько-то молока, зерна, мяса, фуража, дров. А для защиты от партизан Зуев организовал отряд самообороны... Иногда наш казачий дивизион помогал ему отпугивать "мстителей".

— Сколько вы пробыли в Беларуси?

— В общей сложности чуть больше года. Весной 1944-го в одном из боев был ранен, оказался в лазарете под Новогрудком. Там стояли поселения казаков Донского войска, Кубанского и Терского. Церковь работала, школа, лазарет, мастерские, издавалась газета. Там я встретил свою первую любовь...

К 1944 году отношение немцев к нашим формированиям изменилось из-за участившихся случаев перехода на сторону партизан. Кажется, в Глубоком из гвардейской бригады РОА сразу сбежали 150 человек. Почувствовали, что немцам "капец" скоро будет, ну и переметнулись к партизанам. А те из них "штрафбат" организовали и кинули на немцев в самое пекло, кровью вину искупать. Думаю, никто из перебежчиков не выжил. А если и выжил — после войны все равно был осужден за измену...

В общем, в 1944 году немцы решили, что наши формирования целесообразней использовать в Западной Европе: там русскому или белорусу в немецкой форме бежать некуда, языков он, кроме русского да ломаного немецкого, почти не знает. В итоге белорусские полицейские подразделения, имевшие огромный опыт антипартизанской войны, были переброшены во Францию, на борьбу с "маки". Казачьи станицы из-под Новогрудка ушли в Италию. А я продолжал казачить в Югославии, где был тяжело контужен и потом заново учился говорить...

— Как вы оказались в Великобритании?

— С 1946 года жил в одном из лагерей для беженцев, которые были открыты по всей Европе организацией ЮНИРА — предшественницей ООН. Там находились люди, которые по разным причинам не могли вернуться на родину, которые хотели уехать в любую страну и начать жизнь с чистого листа. Мне повезло — я попал в Великобританию. А казаки, когда-то стоявшие под Новогрудком, по Ялтинскому соглашению были выданы Сталину вместе с детьми, женами, стариками. Всех погрузили в столыпинские вагоны и... прямиком в Сибирь.

Герой публикации (на фото справа) примерял папаху нашему корреспонденту.

— Как складывалась ваша новая жизнь в Британии?

— Работал на шахте. Женился, купил дом, воспитывал детей. В конце 1970-х Маргарет Тэтчер закрыла шахты, за что, кстати, ее на севере Англии ненавидят. Я оказался на пенсии. Слава Богу, пенсия у меня 2000 фунтов в месяц. Дом большой. Машины, правда, нет. Мог бы купить хоть "Бэнтли", но есть проблема — люблю выпить водочки. Ох, и чего только по пьяному делу со мной не случалось! В начале 1950-х годов я состоял в Народно-трудовом союзе (НТС). Журнал "Посев" когда-нибудь видел? Как-то позвали они меня в Мюнхен, на курсы пропагандистов. Взял я отпуск, денежку и поехал. Там на курсах встретил друзей из "Русского корпуса". А по русскому обычаю, что надо в первую очередь сделать, если друзей боевых встретил? Правильно. Обмыть встречу! Пошли в гаштет (ресторан по-нашему). Смотрю, они мнутся, пфенниги считают — в начале 1950-х трудно жилось нашим людям в Германии. Ну, я достал свои кровно заработанные шахтерским трудом фунты стерлингов, и мы как газанули! Через пять дней пришел на курсы, а мне говорят: "Ты отчислен..."

Так я не стал пропагандистом НТС. Может, оно и к лучшему. А то ребята из КГБ не дали бы дожить до пенсии! Очень уж они НТС не любили.

— Вы попали в Великобританию, а в какие еще страны эмигрировали ваши товарищи по оружию?

— Труднее всего было попасть в США и Канаду. Легче — в Аргентину, Чили, Австралию, Бельгию. В Великобритании после войны осело много украинцев из Галичины, русские, белорусы — у них даже церковь автокефальная работает где-то в Манчестере. Многие из наших остались жить в Германии.

— И какой у них уровень жизни? Им государство платит пенсию? Как к ним относятся немцы, ведь они — иностранцы, да еще с таким прошлым, которое немцы сами не хотят вспоминать.

— Первые 7 лет им жилось нелегко. А кому было легко? Особенно в Германии, которую победители сначала разрушили, а потом еще демонтировали все фабрики, заводы и увезли в СССР.

Но уже в 1953 году немцы приняли закон, согласно которому все иностранцы и бесподданные, служившие в германской армии или работавшие на германских предприятиях и в германских организациях во время войны, имеют право на пенсии, пособия, компенсации за потерю здоровья, имущество, недвижимость. С 1953 года Германия начала выплачивать компенсации и своим гражданам, и иностранцам. Мои друзья получили компенсации за ранения и по сей день получают пенсии, как ветераны германской армии.

— Признаться, в это трудно поверить.

— Так я тебе документ покажу. И кое-что еще...

Ветеран казачьего дивизиона штурмовой бригады "Беларусь" Семен Новогрудский встал и, пошатываясь, вышел из кухни. Через 10 минут он вернулся с новой бутылкой "Абсолюта", двумя полковничьими папахами советского образца и журналом "Русские ветераны Германской армии", в котором, как он уверял, "все про льготы написано".

— На, примерь, — протянул Семен Кузьмич папаху из серого каракуля, — это мои дети ездили в Москву по бизнесу и где-то купили на Арбате...

Спрашивают: хочешь звезду Героя Советского Союза тебе привезем или мундир генерала? Я представил: на 9 Мая надену этот мундир, прикреплю звезду и пойду в украинский клуб, где "бендеровцы" пиво пьют... Они б из меня звезд пятиконечных нарезали! Ох, не любят же "москалей"! И меня не любят. Потому что хоть и на одной стороне воевали, а все одно — я для них "москаль"...

Старый казак рассмеялся и ухватил бутылку "Абсолюта". В свои 85 он плюет на здоровый образ жизни, а вместо лекарств по любому случаю предпочитает пропустить рюмку водки. Я от "Абсолюта" деликатно отказался.

— Печень, — говорю, — уже сигналы подает...

— Оно и видать, что не казак! — сказал он. — Тогда давай прощаться. Мне завтра в церковь с утра... к причастию...

Евгений СУЛЫГА.

Лондон—Бирмингем.

АСОБА

«Абярог» ад Алеся Клышкі

Футбаліст, даследчык, творца, галава сямейства і адданы вернік. Многія пісьменнікі, прачытаўшы гэтае апісанне, пазнаюць у ім свайго паплечніка— Алеся Клышку.

Нарадзіўся Алесь Клышка ў шматдзетнай сям'і, таму і працаваць пайшоў рана — з 16 гадоў. Пасля заканчэння вячэрняй школы паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут. Працаваў на МАЗе, гуляў у футбол за каманду "Тарпеда". Пасля пайшоў на працу ў БПІ, абараніў дысертацыю, стаў кандыдатам тэхнічных навук. Ад пачатку 2007 года працуе ў НДІ прыкладных фізічных праблем Белдзяржуніверсітэта. Мае каля сотні друкаваных навуковых прац і вынаходніцтваў...

"Фізікі і лірыкі" — традыцыйна падзяляюць у жыцці навукоўцаў і творцаў. Алесь Клышка перайначыў гэтую традыцыю, гарманічна спалучыўшы строгія законы навукі і мастацкі хаос літаратуры. Больш таго, паэт даказаў: пачынаць ніколі не позна! Першая кніга творцы з'явілася ў 2002 годзе і мела назву "Ад каранёў да кроны". Потым было выданне, прысвечанае Мінску, — "Шчасце маё". Наступным стаў зборнік "Далёкае блізкае". Магчыма, гэтак праявіцца лірычнаму пачатку Алеся Клышкі дапамагла вера ў Бога, да якога творца прыйшоў ужо ў сталым узросце. Разам з верай жыццё яго ўзбагацілася роднай мовай. У духоўнай сферы паэт працуе гэтак жа актыўна, як і робіць усё ў сваім жыцці. З яго дапамогай былі зладкаваныя паломніцтвы да беларускіх святыняў, у верасні мінулага года адбыўся фестываль хрысціянскай паэзіі ў Сынковічах. Там была прэзентавана кніга "Шлях да Жыровічаў", напісаная ў сааўтарстве з інакам Мікалаем, вядомым яшчэ як паэт **Зьніч** (**Алег Бембель**). Другая сумесная іх кніга носіць назву "Жыровіцкія камяні". Выданні сталі неабходным унёскам у запаўненне вялікага прагалу тэалагічнай літаратуры на беларускай мове.

Алесь Клышка падчас юбілейнай сустрэчы ў Доме міжцаркоўных зносін "Кіданія".

Але на гэтым неўтаймоўны паэт не збіраецца спыняцца — энергіі яму не займаць.

Падчас святкавання 60-гадовага юбілею адбылася прэзентацыя шостай кнігі Алеся Клышкі — "Абярог". Аснову кнігі склалі вершы, падрыхтаваныя ў мінулым годзе для чытання ў радыёперадачы "Начная Свабода": інтымная, патрыятычная, духоўная лірыка. Да таго ж у зборнік увайшло яшчэ некалькі вершаў і інтэрв'ю з паэтам.

"Раней у мяне было шмат вершаў па-руску, цяпер жа пішу толькі на роднай мове. Ёсць, праўда, адзін па-турэцку. У гэтым зборніку я сабраў і арганічна спалучыў лепшыя творы апошняга часу", — распавядае Алесь Клышка пра змест "Абярога". Назву кнігі ён тлумачыць так: *"Для мяне абярог — гэта крыж, вера, малітва. Малітва за нашых памерлых і жывых, якія таксама моляцца за нас. Добраслаўленне. А калі чалавек добраслаўляе іншага, то гэта нясе ў сабе вялікую сілу".* Паэтычны зборнік мае гукавое ўвасабленне ў аднайменным дыску "Абярог", куды ўвайшлі творы Клышкі і інака Мікалая. *"Многім людзям бракуе часу чытаць,* — кажа творца ў размове пра плытку. — *Гукавы варыянт дазволіць ім пазнаёміцца з жаданымі творамі. У планах — выдаць у такой форме кнігі пра Жыровіцкі манастыр".* Паэт не будуе далёкіх перспектыў. *"Цяпер я разумею, якое імклівае жыццё,* — гаворыць ён, — *і імкнуся берагчы і атрымліваць асалоду ад кожнага яго дня".*

Але людзі, што ведаюць Алеся Клышку, не сумняваюцца — без справы ён сядзець не будзе. *"Ёсць літаратары, у клопатах якіх, у справах і думках якіх мяжа паміж бытам і творчасцю непраходная: "і зямлю паарэ, і вершы папіша". А ёсць і такія, што мяжы той і не бачаць, і не ўяўляюць. Быццё для іх — усёчасная сутворчасць, а тварэнне — штодзённае існаванне,* — распавядае пра творцу ў прадмове да "Абярога" старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў **Алесь Пашкевіч** — *Гэтаму сведчанне яго новая кніга, асноўнае крэда якой якраз яскрава і характарызуе згаданую цэльнасць і арганічнасць: берагчы тое, што чалавека робіць Чалавекам, верніка — узвышае да Вечнасці, жыхара Беларусі — да Беларуса. І ў які ўжо раз цвердзіць Біблейскае: напачатку было Слова".*

А завяршыць матэрыял хацелася б пажаданнем **Генадзя Бураўкіна**, якое прагучала падчас прэзентацыі зборніка вершаў Алеся Клышкі:

І я жадаю Клышку:
"Шаноўны наш Алесь!
Не траць сябе пакрышку,
А аддавайся ўвесь
Не мітусні,
Не славе,
Не золату акрас,
А той свяшчэннай справе,
Што паяднала нас,
І ў гэты час суровы,
Што ў душы цягне лёд,
Будзь мужны і здаровы
Яшчэ паўсотні год!"

Дар'я ГАРОШКА.

ЧУЛІ?

Каб жа такая шчодрасць была да школ і бальніц!

Закрытаму акцыянернаму таварыству "Хакейны клуб "Дынама-Мінск" у 2008 годзе будзе аказана дзяржаўная падтрымка да 3,2 млрд рублёў. Гэта прадугледжвае спецыяльны ўказ прэзідэнта.

Фінансавая дапамога для клуба выдзяляецца рэспубліканскаму дзяржаўна-грамадскага аб'яднанню "Беларускае фізкультурна-спартыўнае таварыства "Дынама". Форма дапамогі -- "субсідыі за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на гэтыя мэты, у межах сумы падаткаў на дабаўленую вартасць, на прыбытак, а таксама збору ў рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі, што выплачваюцца БФСТ "Дынама", яго арганізацыйнымі структурамі, арганізацыямі <...>, заснавальнікам, удзельнікам або ўласнікам маёмасці, якіх з'яўляецца БФСТ "Дынама", у рэспубліканскі бюджэт".

Сродкі будуць накіроўвацца на "выплату спартсменам, трэнерам і іншым работнікам заработнай платы, прэмій, надбавак, правядзенне спартыўных мерапрыемстваў і ўдзел у іх, набыццё спартыўнай формы, абсталявання, інвентару, аўтобуса і падрыхтоўку спартыўнага рэзерва для нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па хакеі з шайбай, а таксама на іншыя расходы па забеспячэнні вучэбна-трэніровачнага працэсу".

Дзмітрый УЛАСАЎ.

ВНИМАНИЕ!

Попадем под температуру

Минчанам в этот четверг лучше всего кого-либо из семьи оставить дома.

3 апреля Минские тепловые сети будут проводить испытание своего хозяйства на максимальную температуру теплоносителя. Все это действо будет проходить в течение дня (с 6 утра до полуночи), и во время испытаний, как объясняют специалисты, возможно повышение температуры отопительных приборов и температуры воздуха в квартирах горожан.

— Такие испытания проводятся запланированно раз в два года на всех теплосетях, и не только в Минске, — поясняет заместитель начальника управления коммунального хозяйства Министерства ЖКХ Анатолий Шагун. — Делается это весной, чтобы определить надежность работы тепловых сетей и возможности несения максимальной нагрузки. Если будут какие-то неполадки, их можно будет тут же, после завершения отопительного сезона, устранить, чтобы следующей зимой они не проявились в самый ответственный момент.

В чем же могут проявиться эти неполадки? Кроме каких-то утечек на самих теплотрассах, прорехи могут обнаружиться даже в квартире: появится парение или начнет подтекать батарея. Именно поэтому Минские тепловые сети порекомендовали жителям столицы взять на карандаш телефоны диспетчера (298-27-27 или 298-27-37), по которым можно будет сообщить о возникшей проблеме. Если забудете эти телефоны, обращайтесь в ближайшее ЖЭУ. Кстати, испытания будут проходить не во всем городе. Есть целый список улиц, которые попадут под "температуру": это в основном улицы Первомайского, Заводского, Ленинского, Партизанского и Советского районов города.

С чем рифмуется «Оскар»?

Минувший год — год сплошных неудач для «Беларусьфильма»

После того как с санкции главного лица государства в правительственных, ведомственных и городских структурах началась киномобилизация (ее старт — назначение В.Заметалина на должность генерального директора "Беларусьфильма" в самом конце 2006 г.), можно говорить о некоторых позитивных процессах в сфере кино: о налаживании трудовой, организационной и финансовой дисциплины на киностудии, о разработке бизнес-стратегии в киноиндустрии, о внимании к кадровой политике и ряду других, давно назревших проблем.

В отчетах руководителей, курирующих кино, положительные сдвиги в кинопроизводстве 2007 г. основываются на следующих показателях: выпущено 5 игровых и 2 телевизионных фильма (в предыдущие годы из стен киностудии выходило 2—4 картины); ранее производственный год заканчивали в минусе, а нынче прибыль составила 1,3 млрд рублей; поступления от реализации кинопродукции дали 3,2 млрд рублей; наконец, начата реконструкция "Беларусьфильма" и обновление его инфраструктуры, что, по утверждению одного из государственных мужей, превратит белорусскую киностудию к 2009 г. в "маленький Голливуд".

Вместе с тем никто из руководителей кино не отважился сказать еще об одном существенном итоге 2007 г.: увеличение фильмо-единиц в художественном кино не только не дало качественного результата, но и увеличило число слабых фильмов. Минувший год — год сплошных неудач... Вот перечень названий картин: телефильмы "Майор Ветров" и "Рифмуется с любовью", игровые киноленты "Родина или смерть", "Враги", "Чаклун и Румба", "Щит Отечества" (исключаю из списка фильм "Око за око", поскольку он еще не вышел на экраны).

Назовете картину, имевшую общественный резонанс? Нет ее.

Можно лишь говорить о том, что в поле зрения общественности попала белорусско-российская военная драма Марии Можар "Враги", разделившая аудиторию на защитников и противников. Показателем служит положительная в целом оценка прессы, да и фестивальная судьба фильма сложилась вполне прилично: около десяти поощрений, в основном за дебют и актерские работы.

Определенный зрительский интерес проявлен к мелодраме Александра Ефремова "Рифмуется с любовью". Тема милосердия и добра, а тем более связанная с последствиями Чернобыля, актуальна и имеет спрос даже если предложен лишь ее художественный абрис — без углубления в характеры и социальную жизнь.

Оппоненты назовут высокий рейтинг у телеаудитории первой серии "Майора Ветрова" (чуть более 40%). Отвечаю: квалифицированная рекламная кампания, проведенная создателями, действительно увеличила число зрителей, однако в данном случае сам по себе рейтинг еще не является оценочным показателем. А другие не появились. "Майор Ветров" окупил в несколько раз производственные затраты — это плюс менеджменту, а не художественным достоинствам телефильма.

Отслеживание информации, которая выходит из уст руководителей кинематографа, подтверждает давний ведомственный принцип: предпринятые меры и положительную динамику — осветить прожектором, "укрупнить" в цифрах, а качественные характеристики — увести в тень.

Трезвый, безбоязненный самоанализ — не про наших управленцев и многих режиссеров-"игровиков".

В минувшем году появился новый повод для публичных литавров — якобы грядущий триумф белорусского кинематографа. Его визуальный образ, обошедший несколько государственных изданий — фигура генерального директора киностудии, склонившегося в позе стратега над развернутым макетом будущего "маленького Голливуда". Директорская презентация предстоящих побед настолько возбудила СМИ, что те жирным шрифтом оттиснули заголовки: "Количество+качество= "Оскар" и "Беларускае кіно: дайсці да першага "Оскара"!

По этому поводу в киношной среде язвили: закажем "дядюшку "Оскара" по интернету. В сувенирных магазинах Лос-Анджелеса его имитационная копия стоит всего 35 долларов. Выгравируем "Best studio "Belarusfilm" и преподнесем той персоне, которой ее очень хочется заполучить — пусть тешится. Ну и что, что мир не узнает?!

Чтобы пускать в ход версию об "Оскаре", надо иметь хотя бы на подходе своих Михалковых, а их в белорусском кино нет и, полагаю, не явятся при нынешней системе, которой чужда свобода творчества. Управленческая психология хоть и ушла от пролетарского лозунга "Кино освещает темноту, кино просвещает бедноту", но так и не пришла к современному мышлению, во многом оставаясь на уровне идеологической лозунговости. В такой атмосфере может родиться разве что кинопричуда, посвященная 90-летию Вооруженных сил Республики Беларусь. Имею в виду фильм "Щит Отечества" (сценарий полковника Александра Мышалова, постановка дебютанта Дениса Скворцова).

Вот краткая суть фильма, анонсированного в прессе: "Профессия Алексея Стрижева — защищать небо Родины на земле. И он его защитит... Вопреки коварным проискам западных разведок! Шпион с "говорящей" фамилией Оуэн потерпит фиаско, и ключи от нашего неба будут в надежных руках молодых офицеров". Стиль журналиста соответствует содержанию картины, хотя молодой режиссер попытался, используя "клиповую" манеру, хоть как-то преодолеть сценарный примитивизм. На рекламном щите (бигборде) афишу фильма следовало бы изобразить так: на нас смотрит симпатичный выпускник Военной академии, облаченный в парадный китель и джинсы, на голове — фуражка с кокардой, а обут в кроссовки.

Опыт фильма "Щит Отечества" свидетельствует, на мой взгляд, о том, что время прямолинейных художественных киноагиток закончилось. Действенная пропаганда предполагает высокий профессионализм, которому следует учиться у того же Никиты Михалкова в "12". Государственным мужам режиссер шлет послание: "усыновите" Чечню, и тогда Россия избавится от проблем в этом регионе. Обыкновенным зрителям постановщик внушает: перестаньте стенать, лучше совершите благородный поступок во имя того, кому хуже, чем вам. Можно поразному относиться к михалковской кинопроповеди, но нельзя отрицать, что лишь на таком — гуманистическом — уровне патриотические идеи способны отзываться в массовом сознании.

Нынешнюю ситуацию на "Беларусьфильме" можно обозначить как движение к кинобизнесу, а значит, изживание иллюзий и решение кинопроизводственных проблем "с бородой". Движение осуществляется рывком, как это происходит в некоторых других отраслях. На этом пути подлинная деловитость куда важнее, чем шум по созданию имиджа. Осмыслению и переосмыслению должны быть подвергнуты многие закостеневшие догмы и управленческие стереотипы. Назову лишь один из приоритетов, сформулированный нашими киномастерами два десятилетия назад, но так и не услышанный пока в высших эшелонах власти и в ведомственной среде: отечественному зрителю и всему миру белорусский кинематограф будет интересен тогда, когда посмотрит на сегодняшние проблемы без розовых очков и углубится без боязни в собственное минувшее — давнее и недавнее. Этот приоритет афористично сформулировал киновед, доктор искусствоведения Анатолий Красинский на научно-практической конференции в Белорусском союзе кинематографистов в 2001 г.: "Кто мы, белорусы, на поле истории?"

Алла БОБКОВА, кинокритик.

ТЕНДЕНЦИИ

Что в моде этой весной?

"Нечто среднее"— главный силуэт сезона

В этом сезоне дизайнеры предлагают приглушенно-сдержанную нейтральную палитру всех оттенков серого и шоколадного, оживленную редкими вспышками цвета. Выбор между аристократичной сдержанностью и идеями яркого смешения стилей каждый делает сам.

Из всех "цветастых" вариаций этой весной ставка делается на экзотику и этнику: восточные мотивы, оригинальные орнаменты в сочетании с простыми фасонами. Тесьма, витиеватая вышивка, бахрома придают многим моделям этнический характер.

Смелыми цветовыми хитами сезона будут фиолетовый и желтый всех оттенков. Цвет, без которого нельзя обойтись ни этой, ни другой весной, — белый.

В фаворе пышность. Нужный объем достигается с помощью многочисленных оборок, рюшей и воланов. В сочетании с легкими и полупрозрачными тканями — шифоном, тюлем — они смотрятся очень воздушно и почти невесомо. Складки и драпировки в сочетании с насыщенными цветами щедро используются в таких фасонах, как туника или хитон.

Новый силуэт можно описать как "нечто среднее". Самый актуальный наряд весны — гибрид бесформенного и мешковатого платья, популярного весной 2007-го, и четкого, продуманного силуэта прошлой осени.

Силуэт весны не подчеркивает изгибы фигуры, но при этом все же достаточно женственный, чтобы у мужчин не осталось сомнений в женской привлекательности. "Песочные часы", так популярные минувшей осенью, весной позабыты — туго затянутые на талии пояса можно будет ослабить или даже опустить на линию бедер.

Самые актуальные вещи сезона

Плащ

Строгие модели уступают место сложным фасонам со множеством элементов отделки, двойными и тройными кокетками, декоративными пуговицами, оригинальными рукавами и воротниками.

Широкий ремень

Весной ремни и пояса настолько широки, что конкурируют с корсетами. Талию можно подчеркнуть широким поясом или подпоясаться затейливыми ожерельями.

Платформа

Платформа и высокий каблук — главные союзники женщин, когда весна делает платья все короче. В новом сезоне женщину на небывалую высоту поднимают почти все дизайнеры.

Объемная сумка

Этой весной отдают пальму первенства большой мягкой сумке.

Широкие яркие браслеты

Подчеркивают изящные запястья и сразу избавляют от проблемы выбора — с широкими браслетами другие украшения просто не понадобятся.

КОММЕНТАРИЙ СПЕЦИАЛИСТА

Елена ЦОКОЛЕНКО, модельер: «Каждый день носить глубокие декольте, короткие юбки — совершенно ни к чему»

— В целом мода сейчас минималистична и сдержанна, — говорит Елена. —. Я бы посоветовала клиентам женственность во всех ее проявлениях. Отдала бы предпочтение платьям из натуральных тканей: шелк, лен, хлопок. Главное — ни в коем случае не синтетика. Слишком обтягивающие платья не актуальны. Сейчас в моде свободные платья из тонких тканей. Они могут быть полупрозрачными и ничуть не менее подчеркивающими фигуру и соблазнительными благодаря драпировкам.

Тенденций очень много, но каждый "подгоняет" их под себя. Сегодня нет жесткого диктата моды по поводу того, что можно, а что нельзя носить. Конечно, есть вещи, которые просто стыдно надевать. Это то, что по цвету, длине, покрою выглядит вульгарно. Думаю, что каждый день носить глубокие декольте, короткие юбки — совершенно ни к чему.

Если у человека есть вкус, то ему сложно выглядеть неприлично. Тут деньги — не главное. Можно одеваться хорошо и в секонд-хэнде, и на рынке. А вот, как бы ни парадоксально это было, с большими деньгами труднее одеваться стильно. Потому что чем больше возможностей, тем больше выбор. И тем сложнее не ошибиться. Мне кажется, что аристократичность и сдержанность моды относятся в первую очередь не к вещам как таковым, а к манере их ношения. То, как мы носим одежду, — самое главное.

Ольга ПРУДНИКОВА.

СТАЛІЦА

Мінск заквітнее па-новаму

Пятнаццаць новых відаў кветак будзе выкарыстана пры азеляненні сталіцы цяперашняй вясной.

Як паведаміла начальнік аддзела ўтрымання і добраўпарадкавання аб'ектаў зялёнай гаспадаркі УП "Мінскзелянбуд" Анжаліка Пузанкова, сярод навінак — аднагадовыя кветкі дыясцыя, бідэнс, сучасныя гатункі фуксіі, лантана, духмяны карлікавы тытунь і іншыя. Таксама будуць выкарыстаны новыя гатункі і гібрыды традыцыйных відаў кветак: віёлы, бягоніі, петуніі. Плануецца высадзіць прыблізна 300 разнастайнасцяў кветкавых культур — усяго прыкладна 2,2 млн штук.

Паводле слоў А.Пузанковай, восенню мінулага года ў Мінску было высаджана больш за 158 тыс. цыбулін кветак — цюльпанаў, нарцысаў, гіяцынтаў, крокусаў, галантусаў і іншых. Пасадка астатніх кветак будзе пачата пры наступленні спрыяльных умоў надвор'я, як мяркуецца, у канцы красавіка.

З пачатку гэтага года ў Мінску высаджана прыблізна 7 тыс. дрэў. Для пасадкі ўздоўж вуліц выкарыстоўваюцца ліпа, каштан, клён, ясень, таполя кітайская. У горадзе таксама высаджваюць бярозу, вярбу, тую і іншыя пароды дрэў. А.Пузанкова зазначыла, што з гэтага года ў Мінску будзе актыўна ўкараняцца дрэнажна-палівальная сістэма паліўкі дрэў.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

АТЫ-БАТЫ

Бывайце, кірзавыя боты!

Кірзавыя боты з рэчавага забеспячэння вайскоўцаў тэрміновай службы беларускай арміі будуць выключаны праз год-паўтара.

Пра гэта паведаміў намеснік міністра абароны па тыле — начальнік тылу Узброеных сіл генерал-маёр Аляксандр Балігатаў.

Паводле яго слоў, цяпер завяршаецца выдача вайскоўцам апошніх партый кірзавых ботаў, што знаходзяцца на складах з часоў Савецкага Саюза.

Пры гэтым намеснік міністра падкрэсліў, што частка гарнізонаў Узброеных сіл, напрыклад, Мінскі, Бабруйскі, Гродзенскі, Віцебскі, ужо поўнасцю забяспечаны чаравікамі з высокім берцам.

Як праінфармавалі прадстаўнікі службы тылу, да баявой формы адзення вайскоўцаў будзе пастаўляцца абутак ліццявога метаду мацавання падэшвы. Гэта новы абутак на двухслойнай поліурэтанавай падэшве, што валодае, як сцвярджаецца ў прэс-рэлізе, "найлепшымі гігіенічнымі і тэрмаізаляцыйнымі ўласцівасцямі, водаанепранікальнасцю, меншай вагой у параўнанні з абуткам цвіковага або клеяпрашыўнога метадаў мацавання падэшвы".

А.Балігатаў зазначыў, што ва Узброеных сілах ужо на працягу трох гадоў на забеспячэнні няма шынялёў.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Апошняе слова расстралянага маньяка

Былы камандзір роты Гродзенскага райаддзела дэпартамента аховы МУС Беларусі Аляксандр СЯРГЕЙЧЫК перад пакараннем смерцю прызнаўся ва ўчыненні шасці забойстваў, па якіх ён быў апраўданы Вярхоўным судом. На яго дачыненні да гэтых злачынстваў настойвала Генеральная пракуратура.

Аб тым, што А.Сяргейчык пісьмова прызнаўся ва ўчыненні забойстваў, паведаміў журналістам намеснік генеральнага пракурора **Віктар ПРУС**. Ён таксама праінфармаваў, што падчас паўторнага расследавання па эпізодах, не ўключаных у абвінаваўчую пастанову Вярхоўнага суда, Генпракуратура не змяніла свайго меркавання аб дачыненні былога міліцыянера да гэтых злачынстваў.

Нагадаем, 22 мая 2007 года А.Сяргейчык быў прызнаны вінаватым ва ўчыненні шэрагу цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, у прыватнасці, забойстваў, *"учыненых з асаблівай жорсткасцю, з мэтай утаіць іншае злачынства, з хуліганскіх меркаванняў"*, у згвалтаванні, крадзяжы маёмасці, у тым ліку крадзяжы агнястрэльнай зброі, незаконным нашэнні, захоўванні, перавозцы агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў і выбуховых прылад, а таксама ва ўчыненні шэрагу іншых злачынстваў. А.Сяргейчык прыгавораны да вышэйшай меры пакарання.

Інфармацыя аб тым, што былы міліцыянер пакараны, з'явілася ў канцы лістапада.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

СЧИТАТЬ НЕДЕЙСТВИТЕЛЬНЫМ

Утерянное УНП 100819237, выданное ООО "Белполиимид".

ПАСЛУГІ

Прыём шклатары і іншая дапамога жадаючым. Тэл. (8-033) 661-11-87 (МТС).

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 2.04.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №